# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ВЫКЛАДАННЯ ТЭМЫ «КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ» У ВНУ НЕГУМАНІТАРНАГА ПРОФІЛЮ

І.С. Фокіна
Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

Сацыяльна-эканамічныя, культурна-прававыя змены, якія адбываюцца ў нашай краіне, прад'яўляюць новыя патрабаванні да прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Сапраўды абароненым у сацыяльным плане можа быць толькі ўсебакова развіты чалавек, здольны хутка змяняць накірунак сваёй дзейнасці згодна са зменай патрабаванняў часу. Сучаснасць патрабуе павышэння моўнай культуры любога спецыяліста. На жаль, у сістэме вышэйшай адукацыі гэты аспект работы часта адыходзіць на другі план у параўнанні з прафесійнымі якасцямі будучага спецыяліста. З аднаго боку, сучаснаму грамадству патрабуюцца спецыялісты, якія дастаткова добра валодаюць культурай маўлення, а з другога – у сістэме падрыхтоўкі прафесійных кадраў гэтаму надаецца недастатковая ўвага.

З мэтай фарміравання ў студэнтаў камунікатыўнай кампетэнцыі, павышэння моўнай культуры і культуры зносін праграмай ВНУ негуманітарнага профілю ў межах дысцыпліны «Беларуская мова. Прафесійная лексіка» прадугледжана вывучэнне тэмы «Культура маўлення». Гэтая тэма мае найбольшую практычную каштоўнасць: без ведання асноў культуры маўлення ў наш час цяжка ўявіць сапраўднага спецыяліста ў любой сферы дзейнасці.

Культура маўлення – паняцце шматзначнае. Адна з асноўных задач культуры маўлення - ахова літаратурнай мовы, яе норм. Менавіта літаратурная мова – гэта тое, што ў моўным плане аб'ядноўвае нацыю. Фарміраванне літаратурнай мовы неад'емна звязана з фарміраваннем, станаўленнем і зацвярджэннем норм літаратурнай мовы. Ва ўмовах білінгвізму і даволі высокай ступені інтэрферэнцыі задачай выкладчыка на занятках па тэме «Культура маўлення» становіцца не проста ўзнаўленне (бо нормы літаратурнай мовы павінны быць засвоены яшчэ у межах школьнага курса «Беларуская мова») і замацаванне норм літаратурнай мовы, а выпрацоўка дакладнага навыку размежавання фактаў дзвюх блізкародных моў.

У сувязі з гэтым мэтай вывучэння тэмы «Культура маўлення» становіцца фарміраванне **маўленчай кампетэнцыі** (павышэнне

ўзроўню валодання мовай, маўленчых уменняў і навыкаў студэнтаў) і **маўленчай актыўнасці** (рэальнага выкарыстання набытых уменняў і навыкаў у маўленчай практыцы і працэсе камунікацыі).

Пасля вывучэння тэмы студэнты павінны:

– мець уяўленне аб асноўных спосабах спалучальнасці лексічных адзінак і асноўных словаўтваральных мадэлях;

– валодаць навыкамі і ўменнямі маўленчай дзейнасці ў дачыненні да сферы бытавой і прафесійнай камунікацыі;

– ведаць характэрныя спосабы і прыёмы адбору моўнага матэрыялу ў адпаведнасці з рознымі відамі маўленчых зносін;

– умець устанаўліваць лінгвістычныя сувязі паміж блізкароднаснымі мовамі;

– валодаць навыкамі самастойнага складання тэкстаў розных стыляў мовы;

– умець працаваць з арыгінальнай літаратурай па спецыяльнасці;

– валодаць навыкамі падрыхтоўкі тэкставых дакументаў ва ўпраўленчай дзейнасці, мець уяўленне пра стандарты відаў і разнавіднасцей службовых дакументаў, формы дагавораў, кантрактаў, патэнтаў;

– валодаць асноўнай іншамоўнай тэрміналогіяй спецыяльнасці, ведаць беларускія адпаведнікі асноўных слоў і выразаў прафесійнай мовы;

– валодаць асновамі рэферыравання і анаціравання літаратуры па спецыяльнасці;

– мець навык работы са слоўнікам.

Такім чынам, работа па развіццю ўменняў і навыкаў вуснай і пісьмовай мовы, фарміраванню маўленчай кампетэнцыі і маўленчай актыўнасці студэнтаў павінна адбывацца на адпаведным для той ці іншай спецыяльнасці матэрыяле з улікам тэрміналагічнай базы профільных прадметаў будучых спецыялістаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Абабурка, М. Культура беларускай мовы / М. Абабурка. – Мінск: Выш. шк., 1994. – 122 с.

2. Культура русской речи: учебник для вузов / под ред. проф. Л.К. Граудиной и проф. Е.Н. Ширяева. – М.: НОРМА–ИНФРА М, 1999. – 560 с.

3. Культура русской речи: энциклопедический словарь-справочник / под ред. Л.Ю. Иванова, А.П. Сковородникова, Е.Н. Ширяева [и др.]. – 2-е изд., испр. – М.: Флинта Наука, 2007. – 840 с.

4. Лазарева, Н.М. Проблемы лингвистического образования студентов негуманитарных специальностей вузов / Н.М. Лазарева // II Международные Бодуэновские чтения: Казанская лингвистическая школа: традиции и современность (Казань, 11–13 декабря 2003 г.): Труды и материалы: в 2 т. / под общ. ред. К.Р. Галиуллина, Г.А. Николаева. – Казань: Изд-во Казанск. ун-та, 2003. – Т. 1. – С. 52–54.